# БЕЛАРУСКІЯ АБРАДЫ І СВЯТЫ: ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ

***П. А. Гуд,***
*канд. гістарычных навук,*
*праф. каф. рэжысуры абрадаў*
*і свят БДУКМ*

## РЭЖЫСЁРСКІ ПРАЭКТ СВЯТА

Святы, абрады і традыцыі як састаўная частка духоўнай культуры беларусаў з’яўляюцца важным фактарам эстэтычнага афармлення быту, развіцця народнай творчасці, выхавання нацыянальнай самасвядомасці.

Многія даследчыкі і практыкі лічаць, што рэжысёрскі праект свята ахоплівае не толькі святочную драматургію і рэжысуру, але і архітэктурнае, дэкаратыўнае афармленне, сучасныя тэхналогіі, распрацоўку новых прыёмаў выразнасці пры ўвасабленні тэатралізаваных дзей, арганізацыйныя і фінансавыя аспекты падрыхтоўкі свята.

Існуюць розныя метады работы рэжысёра над рознымі па форме масавымі відовішчамі. Абавязковай для ўсіх відаў і форм з’яўляецца пэўная паслядоўнасць рэжысёрска-пастановачных работ.

У параўнанні з тэатральным жанрам, дзе зместам рэжысёрскага пастановачнага плана з’яўляецца, галоўным чынам, рэжысёрскі аналіз п’есы і рэжысёркая экспплікацыя дзей, рэжысёрскі праект свята – праграма задумы, распрацоўкі і ўвасаблення свята па ўсіх аспектах творчага, матэрыяльна-тэхнічнага, арганізацыйнага і фінансавага рашэння святочных дзей.

Шматлікія бяседы і інтэрв’ю з арганізатарамі свят і фестываляў паказваюць, што многія рэжысёры былога СССР, асабліва ў рэспубліках Сярэдняй Азіі, Каўказа і некаторых абласцях Украіны – гэта сучасныя або былыя тэатральныя рэжысёры,

якія да гэтага часу карыстаюцца тэатральнай традыцыяй рэжысёрскай распрацоўкі і ўвасаблення дзеі і механічна пераносяць свае былыя тэарэтычныя веды і творчыя навыкі на свята.

Многія з іх карыстаюцца ўжо гатовымі сцэнарыямі, якія распрацоўваюць сцэнарысты, а затым абмяжоўваюць сваю работу выключна ідэйна-тэматычным аналізам і рэжысёрскай эксплікацыяй ужо гатовага твора. Падобная работа праводзіцца, як правіла, і з уласнымі сцэнарыямі такіх рэжысёраў. На навукова-практычнай канферэнцыі рэжысёраў у г. Харкаве (Украіна, 2012) было выяўлена, што арганізацыйна-вытворчы план свята ў пераважнай большасці такіх работ робіцца па мінімуму або застаецца па-за ўвагай аўтараў, таму пры ўвасабленні свята часта ўзнікае многа недаробак і непаразуменняў ў вырашэнні многіх пытанняў сувязі творчага і матэрыяльнага, арганізацыйнага і фінансавага забеспячэння свята, у выніку чаго першапачатковая задума рэжысёра застаецца часткова або ў значнай ступені нерэалізаванай.

Беларускі рэжысёр Р.В. Майзельс яшчэ ў 80-я г. ХХ ст. звяртаў вялікую ўвагу на першапачатковы этап стварэння рэжысёрскага праекта – творчую заяўку на правядзенне свята. На гэтым этапе, па думцы Г. В. Майзельса, поўная рэжысёрская распрацоўка свята яшчэ не патрэбна, паколькі яно яшчэ толькі нараджаецца і таму неабходна вызначыць толькі агульныя накірункі свята і прадставіць іх заказчыку, які вырашае мэтазгоднасць далейшай распрацоўкі свята. Па методыцы Р. В. Майзельса ён спачатку выяўляў ідэйна-тэматычную накіраванасць свята і яго падзейную аснову, затым ствараў агульную канцэпцыю (праграму) свята, вызначаў агульныя творчыя і арганізацыйныя пытанні ўвасаблення, асноўных арганізатараў і прыблізны каштарыс свята. У сукупнасці гэта ўсё давала магчымасць уявіць агульную карціну святочных дзей у творчым, арганізацыйным і фінансавым аспектах іх увасаблення.

Канцэпцыю Р. В. Майзельса ў далейшыя дзесяцігоддзі падтрымалі і выкарысталі ў святочнай практыцы беларускія рэжысёры М. І. Цэйцін, Г. В. Рабіль, У. М. Пашко, В. П. Мароз, А. Г. Фядотаў, П. А. Гуд і інш. Так, беларускі рэжысёр А. Г. Фядотаў пры пачатковай распрацоўцы першага Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур асноўную ўвагу звярнуў не на сцэнарый, а на стварэнне агульнай канцэпцыі і праграмы свята, якія б далі магчымасць уявіць падзейнасць, ідэйна-тэматычную



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

накіраванасць, агульны парадак і кампазіцыю святочных дзей, што ў выніку стала моцным штуршком для далейшай распрацоўцы і ўвасаблення свята.

Вядомы расійскі рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Расіі А. Д. Сілін [19, с. 184–185], распрацоўваючы сцэнарый тэатралізаванага прадстаўлення – урачыстага адкрыцця міжнародных спартыўных юнацкіх гульняў краін СНД, Балтыі і рэгіёнаў Расіі (2002), прапанаваў сваю канцэпцыю распрацоўкі і арганізацыі прадстаўлення, якая ўжо на пачатковым этапе ў зародкавым выглядзе ўтрымлівала ў сабе пэўныя творчыя і арганізацыйныя пытанні ўвасаблення дзеі і складала аснову творчай заяўкі на правядзенне свята.

Аналіз навуковай і метадычнай літаратуры паказвае, што многія замежныя рэжысёры пры распрацоўцы любога віда свят прытрымліваюцца пэўнай паслядоўнасці падрыхтоўчых работ. Спачатку здзяйсняецца пастаноўка мэты свята, фармулююцца яго задачы і выяўляецца сэнс яго правядзення. Адштурхоўваючыся ад ідэі, прадумваецца сюжэт праграмнай часткі свята і агульная схема развіцця падзей праз канкрэтныя дэталі – тэрміны і час правядзення свята, выбар пляцоўкі, падбор конкурсаў, запрашэнне артыстаў, распрацоўка і выраб мастацка-дэкаратыўнага афармлення, ставяцца патрабаванні да месца правядзення свята (перш за ўсё забяспечанасць пунктамі грамадскага харчавання і рознічнага гандлю, бытавымі паслугамі, пунктамі медыцынскай дапамогі, аховы парадку), вырашэнне розных арганізацыйных пытанняў і інш.

Аналіз тэарэтычных і творчых работ сучасных рэжысёраў Беларусі і замежных краін паказвае, што паслядоўнаць рэжысёрска-пастановачных работ складаецца з наступных этапаў:

1) асэнсаванне мастацка-творчых задач, пастаўленых заказчыкам перад рэжысёрам-пастаноўшчыкам;

2) вызначэнне маштаба відовішча і месца яго правядзення;

3) работа над сцэнарным планам і літаратурным сцэнарыем;

4) стварэнне рэжысёрска-пастановачнай і адміністратыўна-пастановачнай груп;

5) стварэнне аргкамітэта, складанне і зацвярджэнне з заказчыкам фінансавай дакументацыі;

6) работа над пастановачным планам (рэжысёрскі аналіз сцэнарыя, рэжысёрская задума, дакументацыя, работа з пастановачнай групай);

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

7) работа рэжысёра-пастаноўшчыка над арганізацыяй рэпетыцыйнага працэса, з творчымі калектывамі і асобнымі выканаўцамі;

8) складанне плана падрыхтоўкі масавага відовішча;

9) работа з начальнікамі ўсіх тэхналагічных службаў;

10) падрыхтоўка ўсімі службамі рэжысёрскай дакументацыі;

11) правядзенне зводнай і генеральнай рэпетыцыі на асноўнай сцэне або пляцоўцы.

Аналізуючы паслядоўнаць гэтага віду рэжысёрска-пастановачных работ, трэба адзначыць, што ў гэтым пераліку, на наш погляд, адсутнічаюць наступныя раздзелы:

1) вывучэнне і асэнаванне творчых здабыткаў і пралікаў мінулых пакаленняў, якія неабходна ведаць з мэтай далейшага развіцця і ўдасканалення найлепшых знаходак і пераадолення недахопаў пры ўвасабленні ўласнага свята;

2) раскрыццё зместа творчай заяўкі на правядзенне свята як пачатковай асновы будучай дзеі;

3) канкрэтызацыя агульных палажэнняў рэжысёрскай эксплікацыі і рэжысёрскага ўвасаблення, характэрных для ўсіх відаў святочных дзей;

4) вызначэнне агульных заканамернасцей арганізацыйна-пастановачнай работы для свят ўсіх жанраў.

З улікам творчых напрацовак айчынных і замежных рэжысёраў на кафедры рэжысуры абрадаў і свят Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў распрацаваны і апрабіраваны рэжысёрскі праект свята, які ўяўляе сабой праграму ініцыіравання, задумы, творчай распрацоўкі і ўвасаблення святочных дзей, а таксама вырашэнне матэрыяльна-тэхнічных, арганізацыйных і фінансавых аспектаў іх увасаблення.

Мы лічым, што структура рэжысёрскага праекта свята павінна складацца з наступных раздзелаў:

1. Творчая заяўка на правядзенне свята.
2. Задума свята і яе кампаненты.
3. Гісторыка-рэтраспектыўны аналіз развіцця свята.
4. Сцэнарна-рэжысёрская распрацоўка святочных дзей.
5. Рэжысёрскае ўвасабленне свята.
6. Арганізацыйна-вытворчы план свята.

Поўнае раскрыццё зместа рэжысёрскага праэта свята адлюстравана ў агульнакафедральнай навуковай тэме «Сучасныя святы як комплекс традыцыйных і інавацыйных элементаў».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прапанаваны рэжысёрскі праэкт дае магчымасць загадзя запраграміраваць featuresрознабаковыя творчыя, матэрыяльна-тэхнічныя, арганізацыйныя і фінансавыя аспекты ўвасаблення свята і прыступіць да ўвасаблення святочных дзей.


1. *Васильев, К. Р.* Организация фестивалей / К. Р. Васильев. – М. : Веха, 2007.

2. *Гордеев, С. І.* Методика організації масових свят / С. І. Гордеев. – Харьків : ХДАК. – 2003. – 9 с.

3. Гуд, П. А. Тэхналогія стварэння свята / П. А. Гуд. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 234 с.

4. *Зайцев, В. П.* Режисура естрады и масовых видовищ / В. П. Зайцев. – Київ : Дакор, 2003. – 304 с.

5. *Петров, Б. Н.* Массовые спортивно-художественные представления : Основы режиссуры, технологии, организации / Б. Н. Петров. – М. : СпортАкадемПресс, 2001. – 352 с.

6. Национальные праздники Великобритании [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://beway.ru/a/natsionalnye-prazdniki-britanii-1119. – Дата доступа: 28.04.12.

7. Праздники и традиции Швеции [Электронный ресурс] Режим доступа: http://www.calend.ru/holidays/sweden. – Дата доступа: 25.03.2012.

8. *Силин, А. Д.* Международные спортивные юношеские игры стран СНГ, Балтии и Регионов Росии / А. Д. Силин // Ю. М. Черняк. Режиссура праздников и зрелищ. – Минск : Тетра Системс, 2004. С. 184–185.

9. *Камінскі, А. Я.* Рэжысура традыцыйнага абраду / А. Я. Камінскі. – Минск : БДУ культуры і мастацтваў, 2009. – 113 с.

10. *Фядотаў, А. Г.* Свята беларускага пісьменства ў школе / А. Г. Фядотаў. – Минск. – 47 с.

11. *Черняк, Ю. М.* Режиссура праздников и зрелищ / Ю. М. Черняк. – Минск : ТетраСистемс, 2004. – 221 с.

12. *Шароев, И. Г.* Режиссура эстрады и массовых представлений / И. Г. Шароев. – М. : Просвещение, 1986. – 463 с.

13. *Шубина, И. Б.* Драматургия и режиссура зрелища. Игра, сопровождающая жизнь / И. Б. Шубина. – Ростов-на-Дону : Феникс, 2006. – 288 с.

14. *Шубина, И. Б.* Организация досуга и шоу-программ / И. Б. Шубина. – Ростов н/Д : Феникс, 2003. – 350 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ